УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4 Беи)я73
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Аўтары:
доктар гістарычных навук, прафесар *А.П. Жытко*;
доктар гістарычных навук, прафесар *А.М. Люты*;
кандыдаты гістарычных навук, дацэнты *А.Э. Лютая*,
*Л.Э. Пракаповіч*, *П.А. Тупік*;
кандыдаты гістарычных навук *А.А. Башмакоў*, *К.А. Бруханчык*

Рэцэнзенты:
кафедра айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ;
доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі
Беларусі і паліталогіі БДТУ *М.Я. Сяменчык*

Пад агульнай рэдакцыяй *А.П. Жытко*

Г 516 **Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму : вучэб.-метад. дапам. У 5 ч. Ч. 5. Прымысловасць. Транспарт. Крэдыт / А.П. Жытко, А.М. Люты, А.Э. Лютая [і інш.]; пад агул. рэд. А.П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2011. – 278 с.
ISBN 978-985-501-925-2.

У дапаможніку асвятляюцца актуальныя праблемы развіцця прамысловасці, транспартнай сістэмы, крэдытна-банкаўскай сферы ў перыяд станаўлення і развіцця буржуазнага грамадства ў Беларусі.

Адрасуецца навукоўцам, настаўнікам і студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3(4 Беи)я73**

**ISBN 978-985-501-925-2 (ч. 5)**
**ISBN 978-985-501-083-9**
**ISBN 985-501-083-3**

© БДПУ, 2011

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях: 1-02 01 01 Гісторыя; 1-02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць*

*У пяці частках*

## *Частка 5*
## ПРАМЫСЛОВАСЦЬ. ТРАНСПАРТ. КРЭДЫТ

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4966

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Глава 4. ЭВАЛЮЦЫЯ КРЭДЫТНА-ФІНАНСАВАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ

Рэформы другой паловы XIX ст. паўплывалі на сацыяльна-эканамічнае развіццё Расійскай імперыі, у тым ліку і заходніх губерняў. Парэформенная эканоміка Беларусі характарызавалася інтэнсіўным развіццём усіх сектараў. У прамысловасці павялічылася колькасць прадпрыемстваў, паглыбілася іх спецыялізацыя, узраслі аб'ёмы выпускаемай прадукцыі, колькасць рабочых. Пранікненне капіталістычных адносін у сельскую гаспадарку прывяло да спецыялізацыі памешчыцкіх гаспадарак. Многія землеўладальнікі пераарыентавалі свае маёнткі на выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі за кошт набыцця сучаснай сельскагаспадарчай тэхнікі, пародзістай жывёлы, якаснага насення, мінеральных угнаенняў. Поспехі буйных гаспадарак былі прадэманстраваны на міжнародных і расійскіх выстаўках, дзе прадукцыя беларускіх маёнткаў атрымлівала ўзнагароды. Неабходнасць арганізацыі якаснага і хуткага збыту вырабленай прадукцыі з'явілася адной з прычын чыгуначнага будаўніцтва, павелічэння водных шляхоў і наземнага транспарту. Разам з тым узраслі абароты ўнутранага і знешняга гандлю, колькасць магазінаў, гандлёвых дамоў. Усе гэтыя змены непазбежна вялі да стварэння новай капіталістычнай крэдытна-фінансавай сістэмы, якая здолела б інвесціраваць галіны эканомікі. У прыватнасці, прамыслоўцам неабходны былі сродкі для набыцця сучаснага абсталявання, пашырэння вытворчасці. Капіталізацыя сельскай гаспадаркі патрабавала наяўнасці іпатэчнага крэдыту. Аптовым купцам неабходны былі вялікія кароткатэрміновыя крэдыты. Чыгуначнае будаўніцтва, пашырэнне водных і наземных шляхоў таксама патрабавала сродкаў. Да 70–90-х гг. XIX ст. склаліся ўсе неабходныя ўмовы стварэння крэдытна-фінансавай сістэмы Беларусі, якая здолела б ліквідаваць недахоп крэдыту для розных галін гаспадаркі, а таксама і насельніцтва.

У Беларусі буйных акцыянерных банкаў, заснаваных на мясцовым капітале, амаль не было (за выключэннем Мінскага камерцыйнага банка). Значнае распаўсюджванне атрымала дзейнасць аддзяленняў Дзяржаўнага банка, філіялаў расійскіх і замежных камерцыйных банкаў, устаноў дробнага крэдыту, невялікіх банкаў, заснаваных на мясцовым капітале, банкірскіх кантор і дамоў, якія займаліся ў асноўным улікам вэксаляў.

Заходнія губерні перажылі чатыры этапы заснавання банкаў:

- 1870–1880-е гг. – банкі ўзнікалі стыхійна, працавалі, як правіла, нядоўга, часта банкруціліся;
- 1880–1890-я гг. – назіралася канцэнтрацыя банкаўскага капіталу і ўтварэнне манапольных кампаній;



- 1900 – жнівень 1914 гг. – перыяд стыхійнага развіцця дробнага крэдыту, з'яўлення шматлікіх кас, капіталаў, таварыстваў;
- жнівень 1914 – студзень 1917 гг. – час перабудовы працы ўсіх устаноў ва ўмовах ваеннага часу (эвакуацыя, спыненне выдачы пазык і інш.).

Банкаўская сістэма заходніх губерняў другой паловы XIX – пачатку XX ст. была прадстаўлена наступнымі ўстановамі:

- аддзяленнямі Дзяржаўнага банка Расійскай імперыі;
- акцыянернымі камерцыйнымі банкамі;
- філіяламі акцыянерных зямельных (іпатэчных) банкаў;
- філіяламі Дваранскага і Сялянскага пазямельных банкаў;
- гарадскімі грамадскімі банкамі;
- банкірскімі дамамі і канторамі;
- таварыствамі ўзаемнага крэдыту;
- установамі дробнага крэдыту (ламбард, пазыковая казна, пазыкова-ашчадныя і крэдытнае таварыствы, мірскія капіталы, земскія касы і інш.).

З 1859 г. пачала ажыццяўляцца фінансава рэформа, у выніку якой у 1860 г. быў адкрыты ***Дзяржаўны банк*** Расійскай імперыі. Патрэбы ў пашырэнні сеткі крэдытных устаноў, кантролю за іх дзейнасцю абумовілі заканадаўчае афармленне праекта аддзяленняў галоўнай банкаўскай установы дзяржавы, які быў адобраны царом 20 снежня 1863 г. Згодна з гэтым дакументам, на чале філіяла стаяў упраўляючы. Кожнае аддзяленне штогод павінна было прадстаўляць кантралёру справаздачу аб выніках сваёй дзейнасці. Пры банках дзейнічалі таксама спецыяльныя ўлікова-пазыковыя камітэты, якія фарміраваліся з мясцовых прадпрымальнікаў і спецыялістаў у фінансавай галіне для кантролю за крэдытаздольнасцю кліентаў аддзялення. Вызначаліся аперацыі, якія павінны ажыццяўляць аддзяленне.

З'яўленне аддзяленняў Дзяржаўнага банка ў заходніх губернях адносіцца да 80-х гг. XIX ст.: 27 кастрычніка 1881 г. было заснавана Мінскае аддзяленне Дзяржаўнага банка, 16 лютага 1883 г. – Магілёўскае аддзяленне, 11 красавіка1883 г. – Віцебскае, 16 жніўня 1884 г. – Гродзенскае аддзяленне Дзяржаўнага банка [12, с. 301, 309, 321, 325].

***Мінскае аддзяленне Дзяржаўнага банка*** было буйнейшым у заходніх губернях. З 1881 г. гадавы абарот банка хістаўся з 52 да 110 млн руб. Банк прымаў сумы на ўклады, вёў улік вэксаляў, выдаваў пазыкі пад тавары да 250 тыс. руб., крэдыты сельскім гаспадарам, прыватным асобам, банкам [12, с. 323]. Буйныя купцы і прамыслоўцы часта звярталіся ў аддзяленне з мэтай атрымання вэксальнага крэдыту. Так, І.Д. Лур'е, уладальнік банкірскай канторы, узяў пазыку



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ